# Знаходкі лічманаў на тэрыторыі Беларусі



**Дзмітрый МАЦЕША**

Член Беларускага нумізматычнага таварыства, Рэспубліка Беларусь, г. Мінск, e-mail: d.matsesha@gmail.com

У папярэдніх артыкулах аўтара было патлумачана, што такое лічман, прыведзена яго апісанне [1; 2]. Таму адразу звернемся да разгляду тэмы знаходак лічманаў на тэрыторыі Беларусі. Нягледзячы на тое, што названая тэма дастаткова вузкая, яна ўсё роўна падаецца важнай, бо яна «жывая»: мае мноства нявырашаных пытанняў, якія час ад часу ўздымаюцца нумізматамі з Беларусі, Польшчы, Літвы.

З моманту выхаду ў свет каталогаў лічманаў Вялікага Княства Літоўскага, Рускага, Жамойцкага і іншых зямель (далей – ВКЛ) і Рэчы Паспалітай «Lietuviški skaičiavimo žetonai 1546–1615» (аўтар E. Ivanauskas, далей – Е. Іванаўскас) [3] і «Podskarbiówki i liczmany Rzeczypospolitej Obojga Narodów i z Rzeczpospolitą powiązane» (аўтар K. Drożdż, далей – К. Дрождж) [4] становішча ў гэтай галіне нумізматыкі істотна змянілася. За 10 гадоў стала вядома пра досыць вялікую колькасць новых экзэмпляраў і нават новыя тыпы такіх лічманаў. Частка лічманаў была знойдзена на тэрыторыі Беларусі раней за выданне названых каталогаў. Гэта важныя звесткі, таму неабходна яшчэ раз узгадаць пра іх. На *малюнку 1* змешчана карта з месцамі знаходак, у табліцы адлюстраваны час і месца знаходак 96 лічманаў. Трэба адзначыць, што на тэрыторыі Беларусі было адшукана больш лічманаў, чым пазначана на карце, але, на жаль, у аўтара няма інфармацыі пра месцы іх знаходак.

Шмат лічманаў было выяўлена ў Заходняй Беларусі недалёка ад мяжы Беларусі з Польшчай (былой мяжы паміж ВКЛ і Польскім каралеўствам). Гэта прыводзіць да высновы, што лічманы маглі выкарыстоўвацца не толькі для лічэння, але і для прадстаўнічых мэт, напрыклад як пацвярджэнне правоў на збор падаткаў для скарбу або мыта пры перасячэнні мяжы. У падтрымку гэтай гіпотэзы сведчыць месца знаходкі трох лічманаў, а менавіта аг. Беражное, што ў Столінскім раёне Брэсцкай вобласці. Паблізу Беражнога былі адшуканы падскарбуўка Лаўрына Войны 1577 г. і дзве падскарбуўкі Яна Глябовіча 1582 г. розных тыпаў. Гэта значыць, на працягу прыкладна 6 гадоў умоўны чыноўнік мог карыстацца названымі лічманамі для пацвярджэння сваіх правоў. Таксама знаходка каля г. Свіслачы (Свіслацкі раён Гродзенскай вобласці) падскарбувак Тэадора Скуміна Тышкевіча (1586 г.) і Дзмітрыя Халецкага (1591 г. і 1595 г.) падобна да ўзгаданай вышэй.

Праз немагчымасць публікацыі падрабязнай інфармацыі пра ўсе лічманы, якія прыводзяцца ў табліцы, спынімся на некаторых з іх. Важна ўдакладніць некалькі момантаў пра лічманы, знойдзеныя да 2014 г.

Так, раней сучасным нумізматам і музейным супрацоўнікам не было вядома месца знаходкі лічмана 1565 г. падканцлера кароннага (1562–1569 гг.) Пятра Мышкоўскага, які захоўваецца ў Гродзенскім дзяржаўным гісторыка-археалагічным музеі (уліковы нумар КП 10235/40, вага 1,59 г, дыяметр 23,6 мм) *(малюнак 2)*. Як высветлілася, пра знаходку гэтага

Малюнак 1




Карта з месцамі знаходак лічманаў на тэрыторыі Беларусі

Малюнак 2



Лічман Пятра Мышкоўскага, 1565 г.

Малюнак 3



Падскарбуўка Тэадора Скуміна Тышкевіча
(знойдзена на Замкавай гары ў Браславе), 1586 г.

Малюнак 4



Лічман майстроў мынцы ў Тыкоціне, 1567 г.

Малюнак 5



Лічман Яна Абрамовіча, 1581 г.

Малюнак 6



Падскарбуўка Яна Глябовіча
(знойдзена каля аг. Дзярэчын Зэльвенскага раёна), 1582 г.

Малюнак 7



Падскарбуўка Яна Глябовіча
(знойдзена каля аг. Беражное Столінскага раёна), 1582 г.

лічмана ўзгадвае Юзаф Ядкоўскі ў сваім артыкуле «Sztabki srebrne z Rybiszek pod Wilnem» [5]. Так, ён піша, што лічман быў адшуканы ў 1930 г. пры будаўніцтве ахоўнага бульвара на Нёмане ад вусця Гараднічанкі ў бок Каложы.

Падчас археалагічных раскопак на Замкавай гары ў Браславе ў 1990 г. была выяўлена падскарбуўка 1586 г. Тэадора Скуміна Тышкевіча, які з'яўляўся пісарам і падскарбіем земскім ВКЛ у 1586–1590 гг. (вага 3,93 г, дыяметр 26,5 мм) [6] *(малюнак 3)*. Зараз гэты лічман захоўваецца ў Браслаўскім раённым аб'яднанні музеяў (уліковы нумар КП 008239).

Адна з цікавых знаходак – лічман 1567 г. майстроў мынцы ў Тыкоціне *(малюнак 4)*. Ён быў знойдзены ў 2010 г. паблізу г. п. Астрына Шчучынскага раёна Гродзенскай вобласці (вага 1,46 г, дыяметр 14–16 мм). Гэты тып лічмана вельмі рэдкі, бо раней было вядома толькі пра 2 экзэмпляры, апісаныя ў каталозе Е. Іванаўскаса.

Пра некалькі лічманаў, што паходзяць з Беларусі, звесткі былі надрукаваны ў каталогах Е. Іванаўскаса і К. Дрожджа, але без указання месца і часу знаходкі. Ніжэй прыведзена інфармацыя пра іх.

Так, лічман Яна Абрамовіча 1581 г. апісаны ў каталозе Е. Іванаўскаса пад № 1-1Ab1581, 2 fig., вага 3,65 г, дыяметр 23 мм *(малюнак 5).* Ён быў знойдзены ў 2013 г. каля в. Стараселле Пінскага раёна Брэсцкай вобласці.

Лічман Яна Глябовіча 1582 г. апісаны ў каталозе Е. Іванаўскаса пад № 10-2GJJ1582, 14 fig., вага 4,01 г, дыяметр 25 мм *(малюнак 6)*. Быў адшуканы ў 2011 г. паблізу аг. Дзярэчын Зэльвенскага раёна Гродзенскай вобласці. Трэба адзначыць, што хутчэй за ўсё ў каталозе пераблытаны фатаграфіі рэверсаў лічманаў 14 fig. і 16 fig.

Яшчэ адзін лічман Яна Глябовіча 1582 г. апісаны ў каталозе Е. Іванаўскаса пад № 11-2GJJ1582, 18 fig., вага 3,264 г, дыяметр 25 мм *(малюнак 7)*. Ён

Малюнак 8



Падскарбуўка Дзмітрыя Халецкага, 1591 г.

Малюнак 9



Падскарбуўка Андрэя Завішы, 1595 г.

Малюнак 10



Падскарбуўка Тэадора Скуміна Тышкевіча (знойдзена ў Гродзенскай вобласці), 1586 г.

Малюнак 11



Падскарбуўка Жыгімонта II Аўгуста, 1570 г.

Малюнак 12



Падскарбуўка Яна Глябовіча (знойдзена ў Мастоўскім раёне), 1582 г.

Малюнак 13



Падскарбуўка Яна Глябовіча (знойдзена каля аг. Ленінскі ў Жабінкаўскім раёне), 1582 г.

быў выяўлены ў 2012 г. каля аг. Беражное Столінскага раёна Брэсцкай вобласці.

Лічман Дзмітрыя Халецкага 1591 г. апісаны ў каталозе Е. Іванаўскаса пад № 3-2Ch1591, 3 fig., вага 2,66 г, дыяметр 25 мм *(малюнак 8)*. Знойдзены ў 2015 г. у Шчучынскім раёне Гродзенскай вобласці.

Яшчэ адна падскарбуўка, на гэты раз Андрэя Завішы, датаваная 1595 г. (у каталозе Е. Іванаўскаса пад № 35-1ZA1595, 38 fig., вага 3,22 г, дыяметр 24 мм), адшукана ў 2009 г. паблізу в. Сялец Лагойскага раёна Мінскай вобласці *(малюнак 9)*.

У каталозе К. Дрожджа пад № 155/34 апісана падскарбуўка 1586 г. Тэадора Скуміна Тышкевіча (вага 3,82 г, дыяметр 25 мм), якая была знойдзена ў 2011 г. у Гродзенскай вобласці *(малюнак 10)* [8].

Падскарбуўка 1570 г. караля польскага, вялікага князя літоўскага Жыгімонта II Аўгуста *(малюнак 11)* была адшукана каля в. Бросты Гродзенскага раёна. Яе вага 2,41 г, дыяметр 24 мм [9].

У 2020 г. у Мастоўскім раёне Гродзенскай вобласці знойдзены лічман 1582 г. земскага падскарбія ВКЛ у 1580–1586 гг. Яна Глябовіча *(малюнак 12)* [10].

Яшчэ адзін лічман Яна Глябовіча (1582 г.) быў выяўлены ў 2016 г. паблізу аг. Ленінскі, што ў Жабінкаўскім раёне Брэсцкай вобласці *(малюнак 13)*.

Лічман субарандатараў віленскай мынцы ў 1584–1588 гг. Пракопа і Даніэля Вяльковічаў знойдзены каля в. Кашубінцы Гродзенскага раёна (дыяметр 24 мм, вага 2,41 г) *(малюнак 14)* [11].

На *малюнку 15* змешчаны лічман 1595 г. падскарбія земскага ВКЛ Дзмітрыя Халецкага, які быў адшуканы ў 2021 г. паблізу в. Бернатоўшчына, што ў Дзятлаўскім раёне Гродзенскай вобласці (дыяметр 25,6 мм, вага 3,21 г) [12].

Малюнак 14



Лічман Пракопа і Даніэля Вяльковічаў, 1584 г.

Малюнак 15



Падскарбуўка Дзмітрыя Халецкага, 1595 г.

Галоўная мэта артыкула – сістэматызацыя інфармацыі аб знаходках лічманаў на тэрыторыі Беларусі, увядзенне яе ва ўжытак. З цягам часу колькасць вядомых лічманаў ВКЛ павялічылася, такім чынам, істотна ўдакладняюцца звесткі, прадстаўленыя ў каталогах. На нашу думку, павелічэнне вядомых месцаў знаходак лічманаў падштурхне навукоўцаў і аматараў да далейшых даследаванняў у гэтай сферы нумізматыкі*.

Табліца

## Звесткі пра лічманы, знойдзеныя на тэрыторыі Беларусі

| Нумар п/п | Эмітэнт | Дата | Месца і год знаходкі | Тып паводле К. Дрожджа |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Ян Лютамірскі | 1551 | Каля в. Варонічы, Полацкі р-н, 2015 | № 2 |
| 2 | Ян Лютамірскі | 1551 | Ваўкавыскі р-н, 2017 | № 2 |
| 3 | Іоб Пратфус (Ян Гозій) | 1559 | Каля г. Бяроза, Бярозаўскі р-н, 2015 | № 8 |
| 4 | Іоб Пратфус (Ян Гозій) | 1559 | Каля в. Каменка, Шчучынскі р-н, 2015 | № 9 |
| 5 | Іоб Пратфус (Ян Гозій) | 1559 | Каля аг. Казлоўшчына, Дзятлаўскі р-н, 2022 | № 9 |
| 6 | Іоб Пратфус (Ян Гозій) | 1559 | Каля в. Васілішкі, Шчучынскі р-н, 2019 | № 9 |
| 7 | Мікалай Радзівіл Чорны | 1559 | Каля в. Марціянаўка, Бярэзінскі р-н, 2015 | № 11 |
| 8 | Габрыэль Тарло | 1564 | Каля аг. Індура, Гродзенскі р-н, 2019 | № 24 |
| 9 | Габрыэль Тарло | 1564 | Каля в. Казловічы, Гродзенскі р-н, 2020 | Не апісаны |
| 10 | Габрыэль Тарло | 1564 | Каля в. Моладава, Іванаўскі р-н, 2015 | Не апісаны |
| 11 | Жыгімонт II Аўгуст | 1569 | Петрыкаўскі р-н, 2017 | № 21 |
| 12 | Жыгімонт II Аўгуст | 1569 | Слонімскі р-н | № 21 |
| 13 | Жыгімонт II Аўгуст | 1570 | Каля в. Бросты, Гродзенскі р-н | № 22 |
| 14 | Жыгімонт II Аўгуст | 1570 | Каля в. Лаздуны, Іўеўскі р-н, 2015 | № 22 |
| 15 | Жыгімонт II Аўгуст | 1570 | Гродзенская вобл., 2022 | № 22 |
| 16 | Пётр Мышкоўскі | 1565 | Каля Каложскай царквы, г. Гродна, 1928–1930 | № 26 |
| 17 | Пётр Мышкоўскі | 1565 | Светлагорскі р-н, 2021 | № 26 |

* Аўтар будзе ўдзячны за звесткі аб знаходках лічыльных жэтонаў ВКЛ і Рэчы Паспалітай на тэрыторыі сучаснай Беларусі і за яе межамі. Інфармацыю (месца, час, склад знаходкі, фота, дыяметр, вага лічманаў) можна дасылаць на электронны адрас: d.matsesha@gmail.com.

Працяг табліцы

| Нумар п/п | Эмітэнт | Дата | Месца і год знаходкі | Тып паводле К. Дрожджа |
|---|---|---|---|---|
| 18 | Пётр Мышкоўскі | 1565 | Каля в. Старая Спуша, Шчучынскі р-н, 2015 | № 26 |
| 19 | Майстар мынцы ў Тыкоціне | 1567 | Каля г. п. Астрына, Шчучынскі р-н, 2010 | Не апісаны |
| 20 | Войцэх Пшэтоцкі | 1569 | Брэсцкі р-н, 2018 | № 31 |
| 21 | Войцэх Пшэтоцкі | 1569 | Каля в. Пральня, Бялыніцкі р-н, 2020 | № 31 |
| 22 | Лаўрын Война | 1577 | Каля в. Сынкавічы, Зэльвенскі р-н, 2014 | № 33 |
| 23 | Лаўрын Война | 1577 | Каля аг. Кардон, Шумілінскі р-н, 2016 | Не апісаны |
| 24 | Лаўрын Война | 1577 | Г. Тураў, Тураўскі р-н, 2016 | № 33 |
| 25 | Лаўрын Война | 1577 | Каля г. Полоцка, Полацкі р-н, 2012 | № 34 |
| 26 | Лаўрын Война | 1577 | Брэсцкі р-н, 2020 | № 34 |
| 27 | Лаўрын Война | 1577 | Каля аг. Беражное, Столінскі р-н, 2022 | № 34 |
| 28 | Лаўрын Война | 1577 | Каля в. Індура, Гродзенскі р-н, 2017 | № 34 |
| 29 | Лаўрын Война | 1577 | Каля в. Гродзі, Ашмянскі р-н | № 34 |
| 30 | Лаўрын Война | 1579 | Нясвіжскі р-н, 2015 | № 37 (апіса-ны як лічман 1577 г.) |
| 31 | Яцэк Младзеёўскі | 1580 | Астравецкі р-н, 2017 | № 40 |
| 32 | Ян Абрамовіч | 1581 | Каля в. Бастуны, Воранаўскі р-н | № 41 |
| 33 | Ян Абрамовіч | 1581 | В. Вярэйкі, Ваўкавыскі р-н, 1999 [7] | № 41 |
| 34 | Ян Абрамовіч | 1581 | Лагойскі р-н, 2008 | № 41 |
| 35 | Ян Абрамовіч | 1581 | Каля в. Стараселле, Пінскі р-н, 2013 | № 41 |
| 36 | Ян Глябовіч | 1581 | Каля в. Шчорсы, Навагрудскі р-н, 2018 | № 42 |
| 37 | Ян Глябовіч | 1581 | Камянецкі р-н, 2015 | № 42 |
| 38 | Ян Глябовіч | 1582 | Каля аг. Беражное, Столінскі р-н, 2014 | № 43 |
| 39 | Ян Глябовіч | 1582 | Каля аг. Дзярэчын, Зэльвенскі р-н, 2011 | № 43 |
| 40 | Ян Глябовіч | 1582 | Мастоўскі р-н, 2020 | № 43 |
| 41 | Ян Глябовіч | 1582 | Каля г. Бялынічы, Бялыніцкі р-н | № 43 |
| 42 | Ян Глябовіч | 1582 | Каля в. Малая Уса, Уздзенскі р-н, 2015 | № 43 |
| 43 | Ян Глябовіч | 1582 | Каля аг. Беражное, Столінскі р-н, 2012 | № 44 |
| 44 | Ян Глябовіч | 1582 | Каля аг. Ленінскі, Жабінкаўскі р-н, 2016 | № 44 |
| 45 | Ян Глябовіч | 1582 | Каля аг. Ленінскі, Жабінкаўскі р-н, 2016 | № 44 |
| 46 | Ян Глябовіч | 1582 | Каля в. Стахаўка, Аршанскі р-н, 2015 | № 44 |
| 47 | Ян Глябовіч | 1582 | Каля в. Маніхі, Вілейскі р-н, 2015 | № 44 |
| 48 | Ян Глябовіч | 1582 | Барысаўскі р-н, 2015 | № 44 |
| 49 | Ян Глябовіч | 1582 | Каля в. Клімавічы, Зэльвенскі р-н, 2017 | № 44 |
| 50 | Пракоп і Даніэль Вяльковічы | Не датаваны | Каля г. Навагрудка, Навагрудскі р-н, 2017 | № 54 |
| 51 | Пракоп і Даніэль Вяльковічы | Не датаваны | Каля г. Навагрудка, Навагрудскі р-н, 2017 | № 54 |
| 52 | Пракоп і Даніэль Вяльковічы | Не датаваны | Слонімскі р-н, 2019 | № 54 |

Працяг табліцы

| Нумар п/п | Эмітэнт | Дата | Месца і год знаходкі | Тып паводле К. Дрожджа |
|---|---|---|---|---|
| 53 | Пракоп і Даніэль Вяльковічы | Не датаваны | Каля в. Крылова, Мінскі р-н, 2015 | № 54 |
| 54 | Пракоп і Даніэль Вяльковічы | Не датаваны | Каля в. Лебяда, Лідскі р-н, 2013 | № 54 |
| 55 | Пракоп і Даніэль Вяльковічы | Не датаваны | Каля в. Кашубінцы, Гродзенскі р-н | № 54 |
| 56 | Пракоп і Даніэль Вяльковічы | Не датаваны | Каля в. Кашубінцы, Гродзенскі р-н | № 54 |
| 57 | Пракоп і Даніэль Вяльковічы | Не датаваны | Каля в. Беліца, Лідскі р-н, 2021 | № 54 |
| 58 | Пракоп і Даніэль Вяльковічы | Не датаваны | Каля в. Каменная Русота, Гродзенскі р-н, 2018 | № 54 |
| 59 | Пракоп і Даніэль Вяльковічы | Не датаваны | Каля в. Аляксандраўка, Дрыбінскі р-н, 2018 | № 54 |
| 60 | Пракоп і Даніэль Вяльковічы | Не датаваны | Каля в. Мазалава, Мсціслаўскі р-н, 2012 | № 54 |
| 61 | Пракоп і Даніэль Вяльковічы | Не датаваны | Маладзечанскі р-н, 2021 | № 54 |
| 62 | Пракоп і Даніэль Вяльковічы | Не датаваны | Каля аг. Стар, Аршанскі р-н, 2013 | № 54 |
| 63 | Пракоп і Даніэль Вяльковічы | Не датаваны | Каля в. Каралін, Зэльвенскі р-н, 2015 | № 54 |
| 64 | Пракоп і Даніэль Вяльковічы | Не датаваны | Каля в. Навіянка, Воранаўскі р-н, 2019 | № 54 |
| 65 | Тэадор Скумін Тышкевіч | 1586 | Замкавая гара ў Браславе, 1990 | № 51 |
| 66 | Тэадор Скумін Тышкевіч | 1586 | Каля в. Араны, Ваўкавыскі р-н, 2007 | № 51 |
| 67 | Тэадор Скумін Тышкевіч | 1586 | Гродзенская вобл., 2011 | № 51 |
| 68 | Тэадор Скумін Тышкевіч | 1586 | Каля в. Поразава, Свіслацкі р-н, 2015 | № 51 |
| 69 | Тэадор Скумін Тышкевіч | 1586 | Брэсцкая вобл., 2019 | № 53 |
| 70 | Тэадор Скумін Тышкевіч | 1586 | Каля в. Боркі, Кобрынскі р-н | № 53 |
| 71 | Тэадор Скумін Тышкевіч | 1586 | Каля в. Уланава, Шклоўскі р-н, 2018 | № 53 |
| 72 | Тэадор Скумін Тышкевіч | 1586 | Слонімскі р-н, 2021 | № 53 |
| 73 | Тэадор Скумін Тышкевіч | 1586 | Каля г. Свіслачы, Свіслацкі р-н, 2015 | № 53 |
| 74 | Дзмітрый Халецкі | 1591 | Каля г. Свіслачы, Свіслацкі р-н, 2008 | № 57 |
| 75 | Дзмітрый Халецкі | 1591 | Карэліцкі р-н, 2016 | № 57 |
| 76 | Дзмітрый Халецкі | 1591 | Шчучынскі р-н, 2015 | № 57 |
| 77 | Дзмітрый Халецкі | 1591 | Каля в. Малашкі, Маладзечанскі р-н, 2019 | № 57 |
| 78 | Дзмітрый Халецкі | 1591 | Навагрудскі р-н, 2020 | № 57 |
| 79 | Дзмітрый Халецкі | 1591 | Лідскі р-н, 2018 | № 57 |
| 80 | Дзмітрый Халецкі | 1592 | Аршанскі р-н | № 58 |
| 81 | Дзмітрый Халецкі | 1592 | Воранаўскі р-н, 2019 | № 58 |
| 82 | Дзмітрый Халецкі | 1595 | Гродзенскі р-н, 2019 | № 59 |
| 83 | Дзмітрый Халецкі | 1595 | Каля в. Бернатоўшчына, Дзятлаўскі р-н, 2021 | № 59 |
| 84 | Дзмітрый Халецкі | 1595 | Каля в. Астрамечава, Брэсцкі р-н, 2022 | № 59 |
| 85 | Дзмітрый Халецкі | 1595 | Каля в. Гарадзішча, Баранавіцкі р-н, 2017 | Не апісаны |
| 86 | Дзмітрый Халецкі | 1595 | Каля г. Свіслачы, Свіслацкі р-н, 2015 | № 59 |
| 87 | Дзмітрый Халецкі | 1595 | Бераставіцкі р-н, 2019 | № 61 |

Заканчэнне табліцы

| Нумар п/п | Эмітэнт | Дата | Месца і год знаходкі | Тып паводле К. Дрождка |
|---|---|---|---|---|
| 88 | Дзмітрый Халецкі | 1595 | Карэліцкі р-н, 2018 | № 61 |
| 89 | Мікалай Фірлей | 1593 | Каля в. Аюцэвічы, Карэліцкі р-н, 2012 | № 68 |
| 90 | Андрэй Завіша | 1595 | Смаргонскі р-н, 2020 | № 72 |
| 91 | Андрэй Завіша | 1595 | Ружаны, Пружанскі р-н, 2021 | № 72 |
| 92 | Андрэй Завіша | 1595 | Каля в. Сялец, Лагойскі р-н, 2009 | № 72 |
| 93 | Андрэй Завіша | Не датаваны | Каля в. Балі, Шчучынскі р-н, 2018 [13] | Не апісаны |
| 94 | Геранім Валовіч | 1606 | Каля в. Ула, Бешанковіцкі р-н, 2022 | № 74 |
| 95 | Геранім Валовіч | 1614 | Каля в. Шчанец, Шчучынскі р-н, 2019 | Не апісаны |
| 96 | Геранім Валовіч | 1614 | Каля в. Курчоўцы Воранаўскі р-н, 2018 | Не апісаны |

**Заўвага.** Складзена аўтарам.

## Бібліяграфічны спіс

1. Матеша, Д. Счетные жетоны XVI–XVII вв. в собраниях на территории Беларуси / Д. Матеша // Банкаўскі веснік. – 2018. – № 2. – С. 24–28.
2. Мацеша, Д. Асаблівасці стылістычнага афармлення і іканаграфіі лічманаў ВКЛ / Д. Мацеша // Банкаўскі веснік. – 2021. – № 11. – С. 64–68.
3. Ivanauskas, E. Lietuviški skaičiavimo žetonai 1546–1615 / E. Ivanauskas. – Kaunas, 2014.
4. Drożdż, K. Podskarbiówki i liczmany Rzeczypospolitej Oboiga Narodów i z Rzeczypospolitą powiązane / K. Drożdż. – Warszawa, 2014.
5. Jodkowski, J. Sztabki srebrne z Rybiszek pod Wilnem / J. Jodkowski // Wiadomości numizmatyczno-arheologiczne Organ towarzystwa naukowego w Krakówie. – Kraków, 1933. – T. XIV. – C. 12.
6. Семянчук, Г. Вынікі археалагічнага даследавання на «Замкавай гары» ў Браславе (1989–1990 гг.) / Г. Семянчук // 2-я навукова-практычная канферэнцыя, прысвечаная 925-годдзю Браслава «Браслаўскія чытанні»: матэрыялы. – Браслаў, 1991.
7. Граблеўская, І. Лічыльны жэтон з вёскі Вярэйкі / І. Граблеўская // Краязнаўчыя запіскі. – Гродна, 2000. – Вып. 5. – С. 57–59.
8. Aukcje na OneBid [Zasób elektroniczny] // One.bid. – Tryb dostępu: https://one.bid/ru/%D0%9C%D0%BE%D0%BD%D0%B5%D1%82%D1%8B-podskarbi%C3%B3wka-liczman-z-mennicy-wile%C5%84skiej-1586-r-T/421058. – Data dostępu: 28.10.2023.
9. Aukcje na OneBid [Zasób elektroniczny] // One.bid. – Tryb dostępu: https://one.bid/ru/%D0%9C%D0%BE%D0%BD%D0%B5%D1%82%D1%8B-Lithuania-Liczman-1570-Vilnius/1780336. – Data dostępu: 28.10.2023.
10. Aukcje na OneBid [Zasób elektroniczny] // One.bid. – Tryb dostępu: https://one.bid/ru/%D0%9C%D0%BE%D0%BD%D0%B5%D1%82%D1%8B-Johan-Nicholas-Hlebowicz-Jeton-1582-Vilnius/815150. – Data dostępu: 28.10.2023.
11. Aukcje na OneBid [Zasób elektroniczny] // One.bid. – Tryb dostępu: https://one.bid/ru/%D0%9C%D0%BE%D0%BD%D0%B5%D1%82%D1%8B-Liczman-PWDW-Vilnius-RR/1895517. – Data dostępu: 28.10.2023.
12. Polska, podskarbiówka, 1595 [Zasób elektroniczny] // Warszawskie Centrum Numizmatyczne Marek Kondrat. – Tryb dostępu: https://wcn.pl/eauctions/220203/details/177337/Polska-podskarbiowka-1595. – Data dostępu: 28.10.2023.
13. Мацеша, Д. Новы тып падліковага жэтона (лічмана) падскарбія вялікага літоўскага Андрэя Завішы / Д. Мацеша // Банкаўскі веснік. – 2020. – № 2. – С. 36–39.

## Findings of Counting Tokens in the Territory of Belarus

**Dzmitry MATSESHA,** NGO “Belarusian Numismatic Society”, Member, Republic of Belarus, Minsk, e-mail: d.matsesha@gmail.com

**Abstract.** The author of the article cites the locations of findings of rare numismatic artifacts – counting tokens of the Grand Duchy of Lithuania and the Polish-Lithuanian Commonwealth. Many tokens have been found in Western Belarus near the border of Belarus with Poland. This, according to the author, indicates that they could be used not only as a means of counting, but also as an item for representation purposes.